# Слонімскае раённае літаратурнае аб'яднанне імя Анатоля Іверса

## *З гісторыі калектыву*

Слонімская зямля багата на літаратурныя таленты: Кандрат Лейка, Гальяш Леўчык, Сяргей Дарожны, Анатоль Іверс, Алесь Сучок, Васіль Супрун, Мікола Арочка, Алег Лойка, Уладзімір Ягоўдзік, Сяргей Чыгрын і шмат яшчэ імёнаў паэтаў-землякоў. Творчую інтэлігенцыю Слонімшчыны аб'ядноўвала вакол сябе раённая газета.



Анатоль ІВЕРС (Іван Дарафеевіч Міско)

У 1994 годзе быў выдадзены першы літаратурны альманах Слонімскага літаб'яднання «Золак над Шчарай». Яго прадстаўлялі літаратары члены Саюза пісьменнікаў: Анатоль Іверс, Іван Сяргейчык, Алена Руцкая, паэты Рудольф Пастухоў, Ірына Войтка, Алена Бурсевіч і іншыя.

З 2002 года па прапанове кіраўніка літаб'яднання Івана Сяргейчыка літаб'яднанне пры раённай газеце «Слонімскі веснік» пачало насіць імя паэта-земляка, партызана-антыфашыста Анатоля Іверса.

У 2005 годзе выйшаў другі альманах слонімскіх літаратараў «Пад гукі паланэза». Побач з імёнамі вядомых літаратараў з'явіліся новыя імёны: Ганна Паўлава, Алена Руж, Святлана Пракоф'ева, паэт Зьніч, Міхаіл Рылко, Мар'ян Медушэўскі.

Чарговы альманах «Старонка» быў выдадзены да Дня беларускага пісьменства ў Слоніме ў 2019 годзе і быў прысвечаны роднаму гораду і роднаму слову. На паэтычным гарызонце Слонімшчыны з'явіліся новыя імёны: Тамара Пяцеліна, Надзея Салейка, Таісія Гуськова, Мікола Емельянчук, Алена Чайкоўская.

Больш за дваццаць кніг выдадзена членамі літаратурнага аб'яднання з 2002 года, каля ста літаратурных старонак змешчаны ў газеце «Слонімскі веснік». Паэты Ірына Войтка і Надзея Салейка з'яўляюцца членамі Саюза пісьменнікаў Беларусі і прымаюць актыўны ўдзел у рабоце Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі.

Члены літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса праводзяць творчыя вечары, прэзентацыі кніг, з'яўляюцца гасцямі бібліятэк і школ горада, удзельнічалі ў творчых сустрэчах з літаратарамі Гродна, Ліды, Баранавіч, актыўна выступаюць у друку. Так у 2019 годзе на Свяце беларускага пісьменства ў Слоніме літаб'яднанне прыняло актыўны ўдзел у рабоце пляцоўкі «Слова пісьменніка» і было ўзнагароджана

Дыпломам Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Саюз пісьменнікаў Беларусі», а ў 2022 годзе ў межах новага літаратурнага праекта абласной пісьменніцкай арганізацыі «ЛітРэгіёнФэст» калектыў творчай суполкі атрымаў тытул «Ганаровы партнёр Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі».

Добрыя стасункі наладжаны ў слонімскіх літаратараў з раённай бібліятэкай імя Якуба Коласа: гэта ўдзел у розных мерапрыемствах бібліятэкі, прысвечаных класікам беларускай літаратуры, памяці паэтаў-землякоў, удзел у розных літаратурных конкурсах. Так, паэткі Тамара Пяцеліна і Галіна Урадзімская сталі пераможцамі літаратурнага конкурсу ў горадзе Гвардзейску (Расійская Федэрацыя), горадзе-пабраціме нашага Слоніма, атрымалі дыпломы і памятныя прызы. Кіраўнік літаб'яднання Ірына Войтка стала пераможцам літаратурнага конкурса ў межах Рэспубліканскага спартыўна-культурнага фестывалю «Вытокі», які праходзіў у Слоніме ў 2023 годзе. На словы яе верша «Роднае слова» кампазітар Валерый Шмат напісаў песню, якую выконвае Арт-група «Беларусы» і якая часта гучыць на радыё і тэлебачанні. Слонімская паэтэса Надзея Салейка стварыла тэкст «Гімна беларускіх спартсменаў» (аўтар музыкі Уладзімір Сукалінскі). Твор гучыць на рэспубліканскіх спартыўных і канцэртных пляцоўках. Актыўна супрацоўнічае з расійскімі літаратурнымі інтэрнэт-рэсурсамі паэтэса Наталля Чартапалохава, якая стала намінанткай Расійскай нацыянальнай прэміі «Паэт года-2023».

З 2006 года кіраўніком літаратурнага аб'яднання імя Анатоля Іверса з'яўляецца член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэтэса Ірына Войтка. Літаратурнае аб'яднанне, створанае пры газеце «Слонімскі веснік», рэгулярна рыхтуе літаратурную старонку ў раёнцы, мае свой архіў. Яно жыве, дзейнічае, праводзіць работу з моладдзю па захаванню, папулярызацыі беларускай мовы і культуры. Людзі прыходзяць на мерапрыемствы і далучаюцца да калектыву, каб наталіць душу хараством і веліччу Слова, каб несці святло і дабрыню па жыцці. Нараджаюцца новыя вершы, ствараюцца новыя песні, выдаюцца кнігі, якія ўслаўляюць наш любы Слонім, нашу родную Беларусь, яе творчых працавітых людзей, яе гісторыю і культуру.

**Ірына ВОЙТКА**



**Слонімскае раённае літаб'яднанне, першы склад: А. Іверс, І. Войтка, А. Руцкая і інш (1980-я гг).**



Слонімскія літаратары Іван Сяргейчык і Ірына Войтка з супрацоўнікамі рэдакцыі газеты «Слонімскі веснік»



Т. Пяцеліна, М. Емельянчук, І Войтка, А. Руж на вернісажы



**Творчы вечар Ірыны Войткі ў Гродне, 2015**



**Дзень роднай мовы ў СШ № 8 г. Слоніма**



**Свята Музыкі і Слова ў сядзібе Н. Салейкі**



**У гасцях у зэльвенцаў**



**Гродзенскія паэты ў гасцях у слонімцаў. 2012 г.**



**З гродзенскімі калегамі. Слонім, 2019 г.**




**Дзень беларускага пісьменства ў Слоніме. Уручэнне дыплома ганаровага ўдзельніка свята Слонімскаму раённаму літаратурнаму аб’яднанню імя Анатоля Іверса (2019)**




**Свае творы духоўнай лірыкі на Дні беларускага пісьменства ў Слоніме чытае паэт Зьніч (Жыровічы)**




**Слонімскія паэтэсы Алена Руж і Наталля Чартапалохава. Дзень беларускага пісьменства ў Слоніме (2019)**



Дыплом

узнагароджваецца

Слонімскае раённае літаратурнае аб’яднанне імя Анатоля Іверса (кіраўнік Ірына Войтка) за актыўны ўдзел у Свяце беларускага пісьменства ў г. Слоніме Гродзенскай вобласці

Старшыня
Гродзенскага абласнога аддзялення
ГА "Саюз пісьменнікаў Беларусі" Л.А. Кебіч

Гродна, 2019

**Памятны дыплом аб удзеле Слонімскага раённага літаб’яднання ў Свяце беларускага пісьменства (2019)**




**Дыплом аб прысваенні звання «Ганаровы партнёр Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаі Беларусі» (2022)**




**Адкрыццё літаратурна-этнаграфічнага музея ў СШ № 8 г.Слонім**




**Сустрэча з калектывам Лідскага раённага літаб'яднання «Суквецце» (Лідская раённая бібліятэка імя Янкі Купалы)**




**Дзень роднай мовы. СШ № 2 г. Слоніма**




**З унучкай Якуба Коласа В. Д. Міцкевіч**



**На 80-годдзі Слонімскай раённай бібліятэкі імя Якуба Коласа**




Альманах «Золак над Шчарай» (1994)




Альманах «Пад гукі паланэза» (2005)




**Альманах «Старонка» (2019)**